# Народны кантроль у дзеянні

сумесны выпуск камітэта народнага кантролю Маскоўскага раёна і універсітэта

*вестні з груп НК*

## А ШТО ЗА ПЛАНАМ?

Нярэдка заходзяць да нас, у камітэт, члены груп народных кантралёраў факультэтаў, пачынаючы свае наведванне са скаргі: «Ніяк справы да ладу давесці не можам».

У такіх выпадках не заўсёды ёсць падстава лічыць, што сядзяць члены групы склаўшы рукі. Не. Часцей за ўсё працуюць, выкрываюць парушэнні і дапамагаюць іх выправіць. Бяда толькі ў тым, што на патрэбныя праверкі і рэйды не заўсёды звяртаюць належную ўвагу. Справа тут, на мой погляд, у няўменні складаць планы (або наогул у зняважлівых адносінах да планавання).

МІЖ ТЫМ, эфектыўнасць работы групы народнага кантролю у многім вызначаецца іменна планам, створаным групай. Яго галоўная мэта? Адлюстраванне, праграміраванне асноўных напрамкаў работы калектыву. Для нас — гэта вучэбная і навуковая работа, матэрыяльна-бытавое забеспячэнне...

Бадай, самае слабае месца — гэта кантроль за вучэбным працэсам. Пункт аб праверцы вучэбнай дысцыпліны студэнтаў можна знайсці ў кожным плане. Гэта добра. Але вось якая думка не дае мне спакою: «Ці не прыйшоў час, калі, згодна са студэнцкім самакіраваннем, камітэт камсамола, члены штаба «КП», вучэбна-выхаваўчай камісіі пачнуць самастойна вырашаць пытанні наведвання заняткаў?».

Тады б члены груп народнага кантролю займаліся «дарослымі» праблемамі. Пакуль жа такія пытанні, як выкананне вучэбных праграм, арганізацыя заняткаў, работа кафедраў па умацаванню сувязі тэматыкі курсавых і дыпломных работ з практычнымі задачамі, паляпшэнне вытворчай практыкі студэнтаў, у планах адсутнічаюць. У той жа час, напрыклад, на філфаку разменьваюцца на дробязі, аддзяліўшы асобным пунктам праверку запаўнення картак выкладчыкаў. На гістфаку ж часам наогул адыходзяць ад непасрэднай работы — праверкі арганізацыі вучэбнага працэсу і плануюць рэйды па высвятленню якасці выкладання лекцый або рэцэнзавання кантрольных работ.

У сувязі з рэформай вышэйшай школы зараз многа гавораць аб самастойнай рабоце студэнтаў. Але ж толькі на радыёфізічным факультэце, ператварыўшы словы ў справу, разглядаюць не толькі гэтае пытанне, але і праблему забеспячэння студэнтаў вучэбнай літаратурай. Толькі народных кантралёраў гістфака і геафака непакоіць, як выконваецца загад № 660. На біялагічным жа факультэце ўся работа па праверцы вучэбнай і навуковай работы звялася да аднаго: выканання інструктыўных пісьмаў МінВНУ БССР.

Кантролем за навуковай работай займаюцца ў асноўным на тых факультэтах, якія заключаюць гаспадарчыя дагаворы. Але ж на біяфаку і факультэце прыкладной матэматыкі не жадаюць звяртаць увагу нават на тыя навуковыя даследаванні, якія ўваходзяць у рэспубліканскую праграму.

Планы пакуль складаюць розныя: ад выдатных на геафаку і факультэце радыёфізікі і электронікі да неканкрэтных і, з гэтай нагоды, нікому не патрэбных. Думаю, не будзе лішнім напомніць, што план — аснова паспяховай работы групы. За яго складаннем адразу паўстае пытанне аб канкрэтнай рабоце па выкананню.

А. МЕЛЬНІКАЎ,
намеснік старшыні КНК універсітэта.

*увага: агляд-конкурс*

## Сродкам галоснасці — дзейснасць

З МЭТАЙ ВЫВУЧЭННЯ і абагульнення назапашанага вопыту выкарыстання сродкаў галоснасці ў дзейнасці органаў народнага кантролю, «Камсамольскага пражэктара» па паскарэнню перабудовы іх дзейнасці ў святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС, студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, Пастановы VI сесіі Вярхоўнага Савета СССР «Аб дзейнасці Камітэта народнага кантролю СССР» з 1 ліпеня да 31 снежня 1987 года будзе праводзіцца гарадскі агляд.

Ён павінен дапамагчы павысіць выніковасць работы органаў народнага кантролю і штабоў «Камсамольскага пражэктара», узмацніць папераджальную работу, забяспечыць большую актыўнасць і наступальнасць у барацьбе з усім, што перашкаджае паскарэнню сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Правядзенне агляду ўключае ў сябе тры этапы.

На працягу першага, які будзе праходзіць у камітэтах і групах народнага кантролю, штабах «КП» прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў горада з 1 ліпеня па 1 кастрычніка 1987 года, неабходна пераабсталяваць і абнавіць стэнды, матэрыялы і дакументы метадычных кабінетаў і куткоў, наладзіць рэгулярны выпуск радыёгазет. Яго вынікі падводзяць аглядныя камісіі.

У час другога этапа (з 1 кастрычніка да 1 снежня 1987 года) праводзяцца раённыя агляды, у якіх прымаюць удзел камітэты, галаўныя групы народнага кантролю і штабы «КП».

Для ўдзелу ў III этапе агляду раённыя камісіі прадстаўляюць планшэты, альбомы, стэнды, падшыўкі «Старонак народнага кантролю» і іншыя матэрыялы.

У час падвядзення вынікаў агляду камісія вывучае работу камітэтаў, груп і пастоў народнага кантролю, штабоў «Камсамольскага пражэктара» па павышэнню эфектыўнасці выкарыстання сродкаў галоснасці ў кантрольнай дзейнасці, зыходзячы з задач агляду.

Будуць улічвацца як змест і перыядычнасць выпуску сатырычных ліcткоў, «Маланак», сатырычных плакатаў, фотаабвінавачванняў, фотагазет і іншых сродкаў галоснасці, рэгулярнасць і якасць публікацый аб рабоце органаў народнага кантролю і «пражэктарыстаў» у насценных і шматтыражных газетах, так і эфектыўнасць работы метадычных кабінетаў і куткоў.

Раённыя камітэты, групы і пасты народнага кантролю, райкомы камсамола, штабы «Камсамольскага пражэктара» і іх актывісты, якія дамагліся лепшых вынікаў па ажыццяўленню галоснасці і эфектыўнасці кантрольнай работы, прадстаўляюцца да ўзнагароды граматамі, дыпломамі і памятнымі падарункамі.

*сатырычным пяром*

## ІМ НЕ ШАНЦУЕ



АД САМАГА ранку Алене Яршовай не шанцавала. Так здарылася, што ноччу стрэлкі гадзінніка раптам прыпынілі свой ход і, не спяшаючыся, са спакойным сумленнем адсталі на дваццаць хвілін. Так атрымалася, што ключ ад пакоя некуды згубіўся, а ліфт у гэты дзень не працаваў. Да таго ж, і гэта было зусім няўчас: святлафор, падміргнуўшы жоўтым вокам, застыў з непрыемнай чырвонай усмешкай.

— А хай гарыць яно ўсё святлом гэтага святлафора, — рашуча махнула рукой Алена і перабегла дарогу, зразумела, не чакаючы згоды з боку бяздушнага трохвокага апарата.

А можа ўсё было зусім не так? Проста не вучыла дзяўчынка Алена вершыкаў аб «паласатай зебры» і «чырвоным, жоўтым, зялёным»? А ў час заняткаў і лекцый па правілах дарожнага руху таксама заўсёды адсутнічала? Але ж цяжка ўявіць сабе, што ў адным толькі універсітэце больш за 70 парушальнікаў, якія не ведаюць нават азбукі дарожнага руху. Сярод іх: С. Багданава, А. Люшкевіч...

Доўга думалі мы, як ім усім дапамагчы, і вырашылі, што поўны курс навучання правілам дарожнага руху старшакурснікі Н. Антановіч, С. Барлак і С. Заяц змогуць прайсці ў школе юных інспектараў руху.

Што ж вы, дзяўчаты і хлопцы? Не саромейцеся! Заходзьце, калі ласка! Там вас сустрэнуць, усё пакажуць і навучаць, што пераходзіць праезджую частку вуліцы можна толькі ў азначаных месцах. Растлумачаць, пакуль яшчэ не позна, што, спяшаючыся па сваіх справах, можна на доўгі час апынуцца далёка ад іх.

Магчыма, шэфская дапамога школьнікаў не спатрэбіцца, калі дэканаты і камітэты камсамола факультэтаў зоймуцца адміністрацыйнымі спосабамі навучання?

Л. ТУРАВЕЦ,
начальнік аддзялення ДАІ Маскоўскага РАУС.

*на пасяджэнні НК*

## ДАРОЖНЫ ЛІСТ У... БЕСКАНТРОЛЬНАСЦЬ

Не так даўно раённым камітэтам народнага кантролю сумесна з дзяржаўтаінспекцыяй і райфінаддзелам была праведзена праверка, якая паказала, што ў некаторых арганізацыях рана допускаюцца недахопы і парушэнні у выкарыстанні гаруча-змазачных матэрыялаў, скажаецца справаздачнасць пройдзенага кіламетражу, неэфектыўна выкарыстоўваецца аўтатранспарт. Мяркуйце самі вось па такім прыкладзе

ГРУЗАВЫ АЎТАМАБІЛЬ, які быў камандзіраваны будаўніча-мантажным упраўленнем трэста «Белспецмантаж» у гарадскі пасёлак Лагойск на 5 дзён, зрабіў толькі два рэйсы. Аднак невядома чаму камандзіровачныя вадзіцель атрымаў цалкам, і ў дарожным лісце адзначаны прабег аўтамабіля — 1254 кіламетры, хоць фактычна ён склаў толькі 300 кіламетраў. Члены камісіі падлічылі, што такім чынам незаконна спісана 353 літры бензіну на суму 106 рублёў. Як расцэньваць такія адносіны да выкарыстання дзяржаўных сродкаў?

Начальнік будаўніча-мантажнага ўпраўлення трэста «Белспецмантаж» В. Ф. Ткачэнка, галоўны механік П. А. Дорагаў, галоўны бухгалтар Т. І. Пунтус, начальнік участка механізацыі А. Г. Краснагір, здаецца, і памятаюць аб існаванні барацьбы з прыпіскамі пры перавозках грузаў аўтамабільным транспартам і забеспячэнні захаванасці гаруча-змазачных матэрыялаў. Але на самай справе не праяўляюць ніякай актыўнасці.

Бескантрольнасць і зніжаная патрабавальнасць з боку кіраўніцтва і бухгалтэрыі прывялі да сістэматычных прыпісак пройдзенага кіламетражу, разбазарвання, нават раскрадання гаруча-змазачных матэрыялаў.

Таму не лічыцца тут выключным выпадкам выпраўленне паказчыкаў спідометраў, часу выезду і вяртання аўтамабіляў у гараж. Не вядзецца падлік расходу гаручага, не ўказваюцца поўнасцю маршруты руху. Здараюцца выпадкі знішчэння дарожных лістоў і выпіскі замест іх фіктыўных.

Падобныя адносіны да прыпісак кіламетражу прымаюць сістэматычны характар. Дастаткова заўважыць толькі, што агульная прыпіска складае звыш 15 тысяч кіламетраў. Вынік? Незаконна спісана гаруча-змазачных матэрыялаў на суму 2408 рублёў і выплачана камандзіровачных 255 рублёў.

Ды і вадзіцелям, калі паразважаць, з якой нагоды хваляваца аб эканоміі і беражлівасці? Усё роўна за эканомію гаруча-змазачных матэрыялаў прэмію не атрымаеш.

Мабыць, усё тым жа, адсутнасцю дзейснага кантролю за эксплуатацыяй транспарту, зніжанай патрабавальнасцю тлумачыцца і тое, што тэхнічны стан аўтатранспартных сродкаў знаходзіцца на самым нізкім узроўні.

За бескантрольнасць за дакладнасцю афармлення дарожных лістоў і адсутнасць таварна-транспартных дакументаў начальніку ўчастка механізацыі будаўніча-мантажнага ўпраўлення трэста «Белспецмантаж» А. Г. Краснагіру вынесена строгая вымова. За адсутнасць кантролю за работай аўтатранспарту на лініі, нізкі ўзровень тэхнічнага стану аўтамабіляў атрымаў строгую вымову і механік П. А. Дорагаў. Пакараны і іншыя добрыя «дзядзі» і «цёці», якія пакрываюць гультаёў і жадаючых пажывіцца за дзяржаўны кошт.

І. ПЯРОЎ.

## ДЫЯЛЕКТЫКА ПРАГРЭСУ І СУЧАСНАСЦЬ

*навуковыя канферэнцыі*

*Міжвузаўскую навуковую канферэнцыю «Дыялектыка сацыяльнага прагрэсу і актуальныя праблемы сучаснасці ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС і студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС» правялі пад эгідай Беларускага аддзялення філасофскага таварыства СССР кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў Белдзяржуніверсітэта і кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі Мінскага вышэйшага ваенна-палітычнага агульнавайсковага вучылішча (МВВПАВ).*



*У РАБОЦЕ канферэнцыі прынялі ўдзел вучоныя БДУ імя У. І. Леніна, БПІ, БТІ імя С. М. Кірава, МРТІ, МВВПАВ, Мінскага вышэйшага інжынернага зенітна-ракетнага вучылішча.*

*Канферэнцыю адкрыў І. Л. Васільеў.*

*На пленарным пасяджэнні ўдзельнікі канферэнцыі заслухалі і абмеркавалі тэарэтычны даклад загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі МРТІ доктара філасофскіх навук Ю. А. Харына на тэму «Актуальныя праблемы тэорыі сацыяльнай дыялектыкі». Дакладчык спыніўся на аналізе метадалагічнай функцыі тэорыі матэрыялістычнай дыялектыкі ў адносінах да сацыяльнага пазнання і сацыяльнага дзеяння. Пленарнае пасяджэнне закончылася абмеркаваннем даклада кандыдата філасофскіх навук В. В. Чарняўскага «Некаторыя праблемы павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у святле «Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне».*

*У рамках канферэнцыі працавалі чатыры секцыі: «Праблемы вайны і міру ў святле рашэнняў XXVII з'езда КПСС», «Грамадства і асоба ва ўмовах паскарэння сацыянальна-эканамічнага развіцця краіны», «Навука ВНУ і экалагічныя праблемы сучаснасці», «Духоўнае жыццё грамадства і культура». У час работы секцый было абмеркавана каля 50 навуковых паведамленняў і праведзены дыскусіі па шэрагу тэарэтычных пытанняў, прыняло ўдзел 7 доктараў філасофскіх навук, 24 кандыдаты філасофскіх, эканамічных і педагагічных навук.*



*На канферэнцыі актыўна абмяркоўваліся пытанні методыкі і ўдасканалення выкладання грамадскіх навук ва ўмовах перабудовы вышэйшай школы, разглядаліся новыя формы выкладання грамадскіх навук, шляхі і сродкі сувязі выкладання з практыкай, выхавання камуністычнай перакананасці. Асаблівая ўвага надавалася пытанням камп'ютэрызацыі навучання ў вышэйшай школе. У гэтай сувязі вельмі карысным з'явіўся праведзены І. Л. Васільевым метадычны паказ абсталявання кабінетаў грамадскіх дысцыплін у МВВПАВ і тэхнічных сродкаў навучання. Знаёмства ўдзельнікаў канферэнцыі з матэрыяльнай базай выкладання грамадскіх навук у МВВПАВ, змястоўны даклад І. Л. Васільева наглядна прадэманстравалі ролю тэхнічных сродкаў навучання ў справе ўдасканалення выкладання грамадскіх дысцыплін ва ўмовах перабудовы вышэйшай адукацыі.*

*Канферэнцыю вызначалі актуальнасць праблематыкі, творчая атмасфера дыскусіі, шырокі ўдзел у абмеркаванні названых пытанняў прадстаўнікоў розных ВНУ, дакладна прадуманая арганізацыя. Канферэнцыя мела важнае значэнне як для распрацоўкі шэрагу тэарэтычных пытанняў і павышэння якасці выкладання грамадазнаўчых дысцыплін, так і ў справе актывізацыі навуковых кантактаў грамадазнаўцаў горада.*

*М. МАЖЭЙКА,*
*в. а. дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.*

*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

*мацаваць традыцыі*

# Прывітанне, Вязынка!



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

ЮБІЛЕІ пачынаюцца па-рознаму. Філфакаўскі, да прыкладу, пачаўся яшчэ а палове



дзесятай гадзіны раніцы, калі да афіцыйнай лінейкі адкрыцця былі добрыя тры гадзіны. Ён пачаўся з добразычлівага «Са святам!» у калідорах факультэта; збіраюцца студэнты, выкладчыкі, безупынку адчыняюцца дзверы камітэта камсамола — штаба свята.

Пэўна, жадала надвор'е паў-



бавіць вясёласці ў студэнтаў, бо як толькі прагучала каманда рухацца, прыпусціў дождж. І над калонай філфакаўцаў зацвілі рознакаляровыя парасоны, а ў вышыню паляцелі прывітальныя лозунгі, песні. Філфак накіраваўся ва універсітэцкі дворык. Тут мінутай маўчання ўшанавалі студэнты памяць тых, хто загінуў у гады вайны. А да мемарыяльнага Знака загінуўшым



студэнтам і выкладчыкам БДУ ад імя факультэта ўсклалі кветкі Ларыса Скрыган, Барыс Паўс, Таня Скакун, Аня Кімстач і Юра Сцепанчук...

Да электрычкі застаюцца хвіліны. Нясуцца думкі ў галаве Ларысы Сяргун, сакратара камітэта камсамола факультэта: хоць бы чаго не забыліся, хоць бы ўсе паселі!

Электрычка набірае хуткасць. Вясёлая яна сёння. І не дзіва — студэнцтва ёсць студэнцтва. Па-



чынаюць беларускую народную песню дзяўчаты. Толькі скончылі — у другім канцы вагона палячкі заспявалі сваю. Так і ехалі ўсю дарогу, па чарзе спяваючы песні.

Вязынка сустрэла вецяркам. Ён абвяваў твары і нібы супакойваў: разганю хмары, святкуйце свята!

Мікалай Паўлавіч Антропаў, старшыня аргкамітэта злёту, тут ужо з учарашняга дня. Ужо стаяць палаткі для журы, гатовы флагшток.

З працы пачынаецца Купала,
З песні, што яднала ўсіх людзей;
З казак, дзе крыві і слёз хапала;
З калыханкі, сонца і падзей.

Узнімаецца ўгару сцяг і абвяшчае, што X злёт студэнтаў-філолагаў у Вязынцы пачынае сваю работу. Злёт вітае дэкан філфака А. А. Воўк. На ўрачыстым адкрыцці злёту вітаюць студэнты ветэранаў, уручаюць ім гваздзікі. Сіненка Георгій Дзмітравіч, выкладчык філфака, звяртаецца да моладзі. І словы пра мір, шчасце, пэўна, хвалююць усіх прысутных. А потым гучыць слова ў дарогу будучым воінам. Дзяўчаты ўручаюць ім сувеніры, кветкі, а старшы выкладчык ваеннай кафедры падпалкоўнік М. І. Іваноў віншуе юнакоў.

Знаходзячыся на купалаўскай зямлі, нельга не гаварыць пра Купалу. Гучаць яго вершы.

На конкурс насценгазет пасля лінейкі накіраваліся ўдзельнікі злёту. Якія прыгожыя газеты зрабілі студэнцкія атрады «Мара», імя Ф. Шменкеля і другі курс беларускага аддзялення! Іменна ім журы прысудзіла прызавыя месцы.

А потым быў парад пірагоў. «Буравеснік», «Верасок», «У дарозе»... Вось дзе журы пашанцавала: пачаставаліся, паспыталі адразу столькі розных пірагоў, тартоў дамашняга гатунку.

Хто пірагі еў, а хто навыперадкі бегаў. Спартыўная эстафета атрымалася вясёлай. Настрой у многіх падняла. Перамогу ў ёй атрымалі дзяўчаты з «Мары».

Ты — суд, паэзія. Ты — суд.
І мрояў нашых, і здзяйсненняў...
Хай думы шчырыя нясуць
Высокі лад тваіх памкненняў!

Прайшла экскурсія ў дом-музей беларускага песняра. А пасля абеду зноў удзельнікі злёту сабраліся разам — ля помніка Я. Купалу прайшла гадзіна паэзіі. Вядзе гадзіну Алег



Антонавіч Лойка, кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Гучаць купалаўскія вершы і пра яго, вершы пра шчасце і родную краіну. Чыталі свае творы маладыя паэты Лена Бохан, шасцікласніца з Мінска, «узлётаўцы» Алесь Бадак, Галіна Ракоца, Славамір Адамовіч, Марына Артукевіч і іншыя. Выступалі госці — Алесь Арпуш, студэнт з наргаса, Анатоль Сыс, працуе на ТБ. Завяршала паэтычную гадзіну Любоў Канстанцінаўна Тарасюк, выкладчыца, былая «узлётаўка».

Свята працягвалася. Ля дома-музея Купалы разыгрывалася сцэна з бессмяротнай «Паўлінкі». Так пачынаўся злётаўскі канцэрт і адначасова — конкурсная праграма філфака ў аглядзе мастацкай самадзейнасці. Паказалі філфакаўцы, што і з песняй, і з танцам, і з жартам сябруюць на іх факультэце.

Сумна было закрываць злёт, але прыемна было ўручаць узнагароды пераможцам. А потым



быў касцёр з песнямі, гульнямі. У гэты момант я гутарыла з М.П. Антропавым, старэйшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі фальклору і дыялекталогіі. Мікалай Паўлавіч з моманту арганізацыі злёту кіруе яго аргкамітэтам. Гэта яму не толькі падабаецца, гэтым ён жыве:

— Сяргей Пражытка 4 гады назад скончыў факультэт. І штогод, чатыры разы ўжо, прыязджае на злёт. Гэта — наша свята. Лічу, што студэнты не



згубілі да яго інтарэсу, і традыцыя наша мацуецца. На маю думку, нараджаецца сапраўдны філфакаўскі, універсітэцкі калектыў у такой вось неафіцыйнай, сяброўскай атмасферы.

Праносяцца побач электрычкі і паязды. Разлівае водар над зямлёй чаромха. У неба ўзносяцца песні. Ціха патрэсквае агонь. Свята не заканчваецца, яно працягваецца ў думках, у паўсядзённых справах...

С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

*з нашай пошты*

## «Спасибо!»

Я ПРЫЕХАЛА ў Савецкі Саюз у 1986 годзе. Тады я ведала па-руску толькі адно слова. Гэта слова — «спасибо». Мяне накіравалі вучыцца на падрыхтоўчы факультэт у г. Горкі. Час ішоў, мы пачалі вывучаць рускую мову, прыйшло разуменне, што гэтая мова мне неабходна, каб авалодаць спецыяльнасцю.

Пачала сур'ёзна займацца мовай. Размаўляла з рускімі студэнтамі. Яны мне дапамагалі. Мы расказвалі адзін аднаму пра свае краіны, абмяркоўвалі цікавыя праблемы. Як мне было цяжка! Руская мова не падобная на маю родную.

Дзякуючы выкладчыку цяпер я ўжо свабодна размаўляю. Вельмі палюбіла вашу мову. Ведаю, што гэтая мова з самай складанай структурай. Але, на маю думку, гэта і самая прыгожая, багатая мова.

ТХАНОМ'ІТ ПХАНІТЧАРАТ,
студэнтка І курса
міжнароднага аддзялення
факультэта журналістыкі.
(Таіланд).

*абяцанкі*

## АДНОСІНЫ БЫЛІ Б ІНШЫЯ...

«Мы, студэнты І курса 3 групы, былі загадзя папярэджаны пра тое, што будзем працаваць на суботніку. Але ж мы не ведалі, што іменна будзем рабіць. А калі б нам да таго ж паведамілі, што будзем працаваць на будаўніцтве нашай студэнцкай сталоўкі, тады і адносіны былі б іншыя»,— гэта не домыслы аўтара, гэта словы з тлумачальнай даведкі, што ляжыць на стале ў прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Тарасевіча. Дробным почыркам на поўнай старонцы вядзецца размова пра тое, хто павінен у нежаданні студэнтаў добра працаваць. Яны абвінавачваюць прараба, рабочых, працу наогул, забыўшыся пра сябе.

Між тым, іменна аб студэнтах клапаціліся ў АГЧ універсітэта, заключаючы пазапланавы дагавор з работнікамі трэста «Будбытрамонт». Да камсамольцаў жа звярнуліся і за дапамогай. Ці цяжка з усяго універсітэта адшукаць 6—8 чалавек у дзень, хаця б толькі на май месяц? Здавалася, не. А на справе атрымалася: амаль немагчыма.

Зразумела, прафесійным рабочым нельга марнаваць час на дапаможных работах, але і такое здараецца, калі вырашаюць студэнты, што ёсць справы больш важныя, чым суботнік, і пачынаюць выбіраць працу лягчэйшую або наогул адмаўляюцца працаваць.

Дарэчы, калі кожны будзе добрасумленна выконваць даручанае, тады (і рабочыя трэста сцвярджаюць гэта з поўнай ўпэўненасцю) сталоўка пачне працаваць з 1 кастрычніка. А калі адносіны студэнтаў да працы будуць іншымі?

Не бяруся меркаваць, што тады атрымаецца. А як лічаць самі студэнты?

З. МАРАВА.

# ПРАВА НА СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

Вышэйшы судовы орган нашай краіны — Вярхоўны Суд СССР выбіраецца Вярхоўным Саветам СССР.

Тэрмін паўнамоцтваў суддзяў вышэйстаячых судоў (як і суддзяў народных судоў) — пяць гадоў.

У Савецкай дзяржаве няма прывілеяваных судоў для якіх-небудзь асобных груп насельніцтва. Правасуддзе ў нас ажыццяўляецца на асновах роўнасці перад законам і судом усіх грамадзян, незалежна ад іх паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі і іншых абставін.

**Кар.: Якія патрабаванні прад'яўляюцца да кандыдатаў у суддзі?**

**В. Г. Ціхіня:** Суддзёй можа быць выбраны любы грамадзянін СССР, які валодае выбарным правам і дасягнуў да дня выбараў 25 гадоў. Якіх-небудзь іншых патрабаванняў да кандыдатаў у суддзі закон не прад'яўляе. Гэта не азначае, што пры вылучэнні ў органы правасуддзя не ўлічваюцца палітычныя і дзелавыя якасці таго ці іншага кандыдата, наяўнасць спецыяльнай адукацыі і жыццёвага вопыту. Ажыццяўленне правасуддзя — складаная і вельмі адказная дзейнасць. Яна патрабуе глыбокіх ведаў, прафесійных навыкаў, умення працаваць з людзьмі і г. д.

**Кар.: Вядома, што ў народных судах грамадзянскія і крымінальная справы разглядаюцца ў саставе старшынствуючага (прафесійнага) суддзі і двух народных засядацеляў. Хацелася б больш дакладна даведацца пра гэтых прадстаўнікоў народа.**

**В. Г. Ціхіня:** Народныя засядацелі раённых (гарадскіх) судоў выбіраюцца з ліку рабочых, калгаснікаў і служачых на сходах працоўных калектываў па месцы работы ці жыхарства адкрытым галасаваннем тэрмінам на два з паловай гады. Народныя засядацелі ваенных трыбуналаў выбіраюцца на сходах ваеннаслужачых на той жа тэрмін.

Сярод народных засядацеляў, выбраных у Беларусі на мінулых выбарах, звыш паловы склалі рабочыя і калгаснікі, жанчыны і беспартыйныя. Узрост кожнага пятага народнага засядацеля — да 30 гадоў. Як бачна, прадстаўлены ўсе сацыяльныя слаі нашага грамадства і ўсе ўзроставыя групы насельніцтва.

Народныя засядацелі ўдзельнічаюць у выкананні сваіх абавязкаў у парадку чарговасці не больш чым два тыдні ў год, акрамя выпадкаў, калі падоўжанне гэтага тэрміну выклікаецца неабходнасцю закончыць разгляд справы, якая была пачата з іх удзелам.

**Кар.: Якімі правамі валодаюць народныя засядацелі ў судовым пасяджэнні?**

**В. Г. Ціхіня:** Як запісана ў артыкуле 153 Канстытуцыі БССР, народныя засядацелі пры ажыццяўленні правасуддзя карыстаюцца ўсімі правамі суддзі. У судовым пасяджэнні яны поўнасцю раўнапраўныя з суддзёй у рашэнні ўсіх пытанняў, якія ўзнікаюць пры разглядзе грамадзянскіх і крымінальных спраў.

**Кар.: Мы ведаем, што некаторыя народныя засядацелі вядуць у судовым працэсе сябе пасіўна, не задаюць асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, ніводнага пытання. Складваецца ўражанне, што яны толькі адбываюць сваю павіннасць у судзе.**

**В. Г. Ціхіня:** Вы правільна намацалі балявую кропку ў працэсе ажыццяўлення правасуддзя. Сапраўды, некаторыя народныя засядацелі выконваюць ролю маўчуноў у судовым пасяджэнні. Яны забываюць, што закліканы ажыццяўляць ад імя працоўных калектываў грамадскі кантроль за работай судоў.

Неабходна пільна адбіраць кандыдатаў у народныя засядацелі. У недалёкім мінулым у гэтай справе нямала было фармалізму. Часам збіралі людзей у абедзенны перапынак, прапаноўвалі невядома кім вылучаную кандыдатуру і пры абсалютна абыякавых адносінах прысутных галасавалі «за». Сёння, ва ўмовах галоснасці, такі падыход да вылучэння кандыдатаў у народныя засядацелі немагчымы. У народныя засядацелі неабходна выбіраць таго, хто не толькі добра працаваў бы на вытворчасці, але і быў сацыяльна актыўным, сумленным, справядлівым, умеў зразумець чужы боль. І, зразумела, нядрэнна, калі б ён крыху быў юрыдычна падрыхтаваны.

**Кар.: Арт. 154 Канстытуцыі БССР абвяшчае, што суддзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону. Як рэальна гарантуецца гэты канстытуцыйны прынцып?**

**В. Г. Ціхіня:** У Савецкай дзяржаве прынцып незалежнасці суддзяў не толькі абвяшчаецца, але і забяспечваецца палітычнымі, эканамічнымі і прававымі гарантыямі.

Як ужо адзначалася, суддзі ў СССР выбіраюцца, а не назначаюцца. Гэта — важнейшая гарантыя іх незалежнасці. Ніхто (нават вышэйшы судовы орган) не можа прама ці ўскосна ўказаць суддзям, якое рашэнне ці прыгавор яны павінны вынесці па канкрэтнай справе. Пры разглядзе спраў забяспечваецца тайна нарады суддзяў — у дарадчы пакой пры вынясенні рашэння ці прыгавору не дапускаюцца чужыя асобы; суддзі не могуць абвяшчаць меркаванняў, выказаных у час нарады.

Гарантыяй незалежнасці суддзяў з'яўляецца асобны парадак прыцягнення суддзяў да дысцыплінарнай адказнасці. Ён усталяваны Палажэннем аб дысцыплінарнай адказнасці суддзяў СССР ад 8 лютага 1982 года. Народныя суддзі ў нашай рэспубліцы не могуць быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, адхілены ў сувязі з гэтым ад пасады ці арыштаваны без згоды Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

**Кар.: Забеспячэнне абвінавачваемаму права на абарону займае важнае месца ў сістэме дэмакратычных асноў сацыялістычнага правасуддзя. У чым сутнасць і значэнне гэтага канстытуцыйнага прынцыпу?**

**В. Г. Ціхіня:** У адпаведнасці з гэтым прынцыпам абвінавачваемы мае права ведаць, у чым яго абвінавачваюць, можа даваць тлумачэнні па прад'яўляемаму абвінавачванню, даваць доказы, заяўляць хадайніцтвы і адводы суду і іншым удзельнікам працэсу, знаёміцца па заканчэнні папярэдняга следства ці дазнання з усімі матэрыяламі справы, удзельнічаць у судовым разборы, абскардзіць дзеянні і рашэнні следчага, пракурора і суда. Гэты пералік правоў абвінавачваемага не з'яўляецца поўным.

**Кар.: Абвінавачваемы, як вядома, можа карыстацца юрыдычнай дапамогай абаронцы. Іншы раз мяркуюць так: навошта абвінавачваемаму абаронца, калі ён сам ва ўсім прызнаўся.**

**В. Г. Ціхіня:** У савецкім крымінальным працэсе абвінавачваемы — гэта яшчэ не вінаваты. Пакуль абвінавачванне не даказана і абвінавачваемы не асуджаны, ён не лічыцца вінаватым. Каб правільна рашыць пытанне пра вінаватасць абвінавачваемага, неабходна даследаваць не толькі факты, якія яго выкрываюць, але і тыя, якія яго апраўдваюць. Таму забеспячэнне абвінавачваемаму права на абарону — гэта неабходныя ўмовы ўстанаўлення ісціны па справе. Тыя грубыя парушэнні сацыялістычнай законнасці, якія нядаўна мелі месца ў нашай рэспубліцы, звязаны у тым ліку і з парушэннем прынцыпу забеспячэння абвінавачваемаму права на абарону.

**Кар.: Валерый Гур'евіч, у чым вы бачыце ролю суда на сучасным этапе развіцця нашага грамадства?**

**В. Г. Ціхіня:** Зараз у краіне ідзе працэс ачышчэння нашага жыцця ад усяго, што супярэчыць прынцыпам сацыялізму, савецкім законам. Цяжка пераацаніць тут ролю органаў правасуддзя, якія закліканы сцвярджаць справядлівасць дадзенымі ім метадамі. Як і раней, адной з важнейшых задач суда застаецца барацьба са злачыннасцю і іншымі правапарушэннямі. Сёння суддзі павінны больш увагі надаваць прафілактыцы (папярэджанню) парушэнняў закона.

На працягу многіх гадоў пры ацэнцы работы судоў было прынята рабіць вывад, што ўсё ў асноўным добра, але маюцца асобныя недахопы. Такі падыход да судовай дзейнасці настройваў на самазаспакоенасць. Суддзі абавязаны крытычна паглядзець на сваю работу, павысіць якасць і эфектыўнасць ажыццяўлення правасуддзя па грамадзянскіх і крымінальных справах. Гэта — наказ часу.

*жансавет дзейнічае*

# ВЯСЁЛАЯ СПАРТАКІЯДА

**ВЯСЕЛЫЯ ГРУПКІ ДЗЯЦЕЙ ЗБІРАЛІСЯ Ў ВЕСТЫБЮЛІ ІНТЭРНАТА № 8. ТАК ПАЧЫНАЛАСЯ «ВЯСЕЛАЯ СПАРТАКІЯДА» З УДЗЕЛАМ ДЗЯЦЕЙ СУПРАЦОЎНІКАЎ УНІВЕРСІТЭТА.**

ЯШЧЭ ГОД НАЗАД, прачытаўшы ў аб'яве, што арганізатарам гэтага мерапрыемства з'яўляецца жаночы савет, мы б вельмі здзівіліся. Звычайна такія абавязкі ўскладаліся на прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі. А вось сёння — на жансавет, створаны, дарэчы, зусім нядаўна.

Вельмі заклапочанымі былі таму І. А. Рабчынская, дацэнт філфака, намеснік старшыні жаночага савета; Л. А. Капылова, выкладчыца кафедры фізічнага выхавання, якая разам са сваімі выхаванцамі, членамі зборнай каманды універсітэта па лыжнаму спорту, праводзіць спаборніцтвы.

...Застаецца ўсяго некалькі хвілін да пачатку спаборніцтваў. Рабяты хвалююцца, гучна размаўляюць. Побач з намі гутараць два сябры Дзіма Жарнікаў і Вася Чарнышоў. На наша пытанне, дзе працуюць іх бацькі, Дзіма кажа:

— Мой бацька працуе загадчыкам лабараторыі радыёфізікі і... нечага там яшчэ.

І тут жа з дзіцячай непасрэднасцю вырашыў збегаць на пяты паверх, каб прачытаць на дзвярах кабінета дакладную назву лабараторыі.

Вася Чарнышоў вельмі ганарыўся тым, што яго мама Т. Т. Чарнышова, інжынер СКТБ, будзе ўдзельнічаць у спаборніцтвах разам з усімі.

Раптам змоўклі ўсе гамонкі, дзеці сталі ў адну шарэнгу. У спаборніцтвах імкнуліся прыняць удзел усе. Вось і чатырохгадовы сімпатычны Коля Карэтка, баязліва трымаючыся за руку старэйшай сястры, шасцікласніцы Олі, стаў разам з усімі. Калі каманды падзяліліся і пачаліся спаборніцтвы, ён пакрыўдзіўся, што Вольга яго пакінула, і заспяшаўся да родных...

Арганізатары мерапрыемства зрабілі ўсё, каб спартыўнае свята запомнілася дзецям. А дзеці ёсць дзеці — з вялікім задавальненнем бегалі, скакалі праз скакалку, выконвалі практыкаванні з мячамі рознай велічыні. У спартыўных гульнях былі пэўныя элементы складанасці, разлічаныя на даволі высокі ўзровень фізічнай падрыхтоўкі. Горача падтрымлівалі іх балельшчыкі.

Для многіх з прыйшоўшых з бацькамі у гэты дзень у спартыўную залу знаёмства са спортам было ўпершыню. Якім яно стане? Дарослыя добра разумелі, што ў гэтых гульнях не павінна быць прайграўшых і пакрыўджаных. Падарункі-прызы дасталіся ўсім.

— У нас запланаваны цэлы шэраг такіх мерапрыемстваў,— гаворыць Ірына Анатольеўна Рабчынская.— Мы яшчэ толькі пачынаем. Спадзяюся, што справы нашы пойдуць добра.

І. РУСЕЦКАЯ,
К. ЧАПЛЯ,
студэнткі факультэта журналістыкі.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.









Рух. Эмоцыі. Здароўе.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
Зак. 1583.
28 мая 1987 г.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.